Н. В. Заяц

# МАСТАЦКАЯ РЭЦЭПЦЫЯ ГОРАДА Ў ЛІРЫЦЫ В. ЗУЁНКА МЯЖЫ СТАГОДДЗЯЎ

Многія вершы Васіля Зуёнка, самабытнага прадстаўніка філалагічнай плеяды пісьменнікаў, прысвечаны ўрбаністычнай тэме. З самага пачатку яна развіваецца ў традыцыйным для літаратурных равеснікаў, гараджан у першым пакаленні, рэчышчы: супастаўленне горада і вёскі, імкненне прымірыць іх у сваёй душы. Універсальнай метафарай для намінацыі гэтага прымірэння стала назва апавядання М. Стральцова "Сена на асфальце". Амаль праз праўстагоддзя жыцця ў горадзе ў вершы "Тост" (1999) В. Зуёнак стральцоўскім вобразам засведчыў сваю неперарваную сувязь з вёскай: "Мы, дзеці сейбітаў і касцоў, / Закінутыя ў горад вясковыя мальцы, / Так і памром, як сказаў Стральцоў, / Сенам на асфальце…" [3].

Аналізуючы зборнік "Крутаяр" (1969), аўтарытэтны даследчык У. Гніламёдаў адзначыў: "Паэт даўно стала жыве ў Мінску, але родная вёска ўладна прыцягвае да сябе. Кожнае наведванне родных мясцін ён успрымае як святочны падарунак. Не, ён не супроцьпастаўляе горад вёсцы, але тым не менш, будучы цвярозым рэалістам у сваіх поглядах на жыццё, выразна адчувае разрыў паміж сучаснымі горадам і вёскай" [1, с. 623]. Паступова гэты разрыў становіцца для мастака яшчэ больш выразным, пра што сведчаць кнігі "Вертыкальныя рэкі святла: вершы сутоку тысячагоддзяў (1993–2006)" [3] і "Шляхам Белага каменя: вершы сустрэчных дзён (2007–2021)" [4].

У вершах В. Зуёнка мяжы тысячагоддзяў трывала замацоўваецца дыхатамія "вёска – горад". Падобна натурфіласофскай лірыцы паэта, дзе надзвычай выразны матыў узаемапрыцягнення зямлі і неба, у творах урбаністычнай праблематыкі таксама рэалізуецца матыў паяднанасці дзвюх розных стыхій у адным чалавеку. Горад і вёска бачацца аднолькава моцнымі полюсамі прывязанасці, прычым першы мае пераважна "змрочную" канатацыю. Аднак ці можна ў сувязі з гэтым гаварыць пра антыўрбанізм паэта? Пагодзімся са слушным назіраннем У. Гніламёдава над ранняй лірыкай і падкрэслім, што адносіны В. Зуёнка да горада больш складаныя. Паэт з пазіцый вяскоўца глядзіць на праявы гарадскога жыцця і параўноўвае, асацыятыўна суадносіць іх са светам вёскі. Змалку звыклы да прастору былы селянін (няхай ужо і з іншым месцам жыхарства) не можа адчуваць сябе камфортна ў падзеленай на кватэры-клеткі прасторы. Тым не менш В. Зуёнак прымае горад такім, які ён ёсць, не дакарае за "бяздушнасць", за раз'яднанасць і адчужанасць насельнікаў: "Горад мой, ты не віноўны ў гэтым, / І маёй віны тут не відаць / Людзі, раз'яднаныя планеты, / Дзе нам сонца крэўнае шукаць?.." [3]. Ён, як героі М. Стральцова, хацеў бы спалучыць неспалучальнае, вынайсці свой аналаг "сена на асфальце", але гэтага не адбылося: "Горад мой, не палічы за здраду, / Што не звёў на ростанях сваіх / Сонечныя вочы палісадаў / І харомы поцемкаў шкляных..." [3] ("Вы прабачце, гарадскія хаты...", 1996).

Урбаністычная тэма ў лірыцы В. Зуёнка звязана найперш з Мінскам – у вершах паўстаюць Траецкае прадмесце, Няміга, метро… Аднак у паэта ёсць яшчэ адзін горад – горад “непаўторнай вясны” Барысаў. У вершы “Бяро́зіна… Беразіна́…” (2012) ён апісваецца ў мажорна-ўзнёслых інтанацыях, што абумоўлена як жанрам (прысвячэнне-зварот да земляка Алеся Камоцкага), так і спецыфікай мастацкага часу (рэтраспекцыя, вяртанне ў гады вучобы ў педагагічным вучылішчы, калі ўсё яшчэ было наперадзе): “Барысаў… Першаю прапіскай / Адзначыў рыфмаю мой спеў… // А ты, Алесь, яшчэ й калыскі / Тады барысаўскай не меў… // Яшчэ ты і не нарадзіўся, / Як я пакінуў горад наш… / А вось жа лёс распарадзіўся: / Нас на раку заве ў вяж… // Ах рэчка, рэчка, дзе твой кацер?.. – // Бяро́зіна, Беразіна́… – // Хто плынь і моц тваю растраціў – / Ледзь не да саменькага дна… // Дзе той паром і дзед, што строга / Нас у загрэбшчыкі стаўляў / І ў Новы горад са Старога, / Лічы, за так перапраўляў…” [4]. Твор уяўляе сабой ланцужок вобразаў-перажыванняў, народжаных згадкай пра горад юнацтва і “радасцю адкрыцця”, пазнавання “свайго”, “блізкага” ў даўно знаёмым чалавеку-творцы. Галоўны тут вобраз Беразіны, што выступае крыніцай натхнення – паэтычнага і музычнага. Агучанае ў фінале прызнанне “А я? – надзею з ёй [Беразіной. – Н. З.] гадую, / Сны па-барысаўску гляджу!..” [4] не толькі выяўляе цёплыя эмоцыі ад успаміну пра вясну жыцця ў Барысаве, але і ў нечым тлумачыць складаныя стасункі з Мінскам, што за доўгія гады так і не змог стаць поўнасцю сваім, калі не ў рэальным жыцці, то ў паэтычным свеце В. Зуёнка дакладна.

Мастак слова спрабуе знайсці кампраміс у адносінах са сталіцай, але не прамінае ў чарговы раз намаляваць яе не надта прываблівай: “У Мінску маленькім / Высокія горы, / У горах высокіх / Глыбокія норы, / У норах глыбокіх / Людзі жывуць, / Кватэрамі / Гэтыя норы завуць…” [3] (“Дзіцячая гульня на пяску”, 1994). Дадзеная праз лаканічны эскіз трапная і досыць вострая ацэнка гарадскога існавання змякчаецца жанрава-фармальнай арганізацыяй верша – імітацыяй дзіцячай пацешкі-забаўлянкі. У іншых творах фарбы згушчаюцца, вобраз нор трансфармуецца ў вобраз пекла, узмацняецца адчуванне бепрытульнасці і адзіноты, выкліканае як урбаністычнымі дэкарацыямі, так і філасофскім разуменнем складанасці быцця, экзістэнцыяльнай адзіноты чалавека ў свеце, што прыходзіць з вопытам: “Жыцця недарэчнасць – / Блукаю ў завеі. / Сагнутыя плечы – / Гадоў маўзалеем. // Жыцця неаспрэчнасць – / Спіць горад у норах. / І рэдкі сустрэчны – / Ці сябра? ці вораг?..” [3] (“Жыцця недарэчнасць…”, 2006).

В. Зуёнак стварае вячэрні або начны ўрбаністычны пейзаж – горад бачыцца заклятым месцам, дзе лірычны герой асуджаны на адіноту. Мастацкая рэцэпцыя ажыццяўляецца праз “інфернальныя” вобразы пекла, ценяў, грэшнікаў, мерцвякоў. У такіх творах горад адначасова і “бязгрэшны грэшнік”, што апынуўся ў пекле, і ўласна пекла, месца пакут: “У ноч, як у пекла, задымлены горад / Ад свету бязгрэшным хаваецца грэшнікам. / Жахаюцца цені, бягуць, як і ўчора, / Як вечна, – зайздроснікі раю

падстрэшнага…” [3] (“Вячэрняе”, 2000). Паўтаральнасць і бясконцасць гарадскіх рытуалаў (вяртанне з працы ў перапоўненым транспарце, пастанная спешка) успрымаецца як вечнае блуканне па колах апраметнай. Побач з філасофскімі ва ўрбаністычнай лірыцы развіваюцца сацыяльныя матывы: уздымаецца праблема п’янства, прадажнасці, бязмоўя, занядбання мінулага і гістарычнай спадчыны. Так, у вершы “Рэха станцыі «Няміга»” (1997) паэт з болем гаворыць пра страту “горада старажытнага”, а разам з ім і беларускага слова, якое пачуеш хіба ў метро: “І ў нетрах – не з пародаю пустой – / З пластамі памяці, што нечысці адсеклі, – / Праз падзямелле пад царквой святой / Свідруемся ў метро, як чэрці ў пекле…” [3].

Ва ўрбаністычнай лірыцы В. Зуёнка пазначанага перыяду актуалізуецца вобраз спустошанай душы: “А над горадам чад і смурод, / Горад п’яны з жыцця пацяшаецца. / Аслабеў, абяскрылеў народ / І душой спусташаецца” [3] (“А над горадам чад…”, 2003); “Вы прабачце, гарадскія хаты, / Ці як вас – дама́мі – тут завуць: / Шматваконны ваш пагляд зіркаты / Цэдзіць не святло, а каламуць. // Ён удушна сцелецца са смогам, / Топчацца нагамі ў шэры брук, – / Як у душах, што зракліся Бога, / Д’ябальскае месіва і бруд” [3] (“Вы прабачце, гарадскія хаты...”). Нягледзячы на гэта паэт прымае горад, прымірaецца з ім. Прадстаўнік іншай, вясковай, культуры, ён захоўвае душэўную гармонію, уласную ідэнтычнасць пры дапамозе памяці пра родныя мясціны, у прыватнасці, пра рачулку маленства Начу, што становіцца абярэгам у гарадской мітусні: “Мне горад лёгка праклінаць: / Я ў горадзе не нарадзіўся. / Мне, быццам, толькі сон прысніўся: / Каменных дыназаўраў раць. // Ад гэтых шэрых скразнякоў / Я Начаю адгарадзіўся / І мерцвяком блукаць згадзіўся / Паміж дзябёлых мерцвякоў” [3]. Мінорная танальнасць і спецыфічная вобразнасць, аднак, не перашкаджаюць успрымаць верш “Мне горад лёгка праклінаць…” (1994), адкуль працытаваны радкі, як аптымістычны і светлы. І ў гэтым заключаецца парадокс, бо аўтар ад развагаў пра месца свайго “ненараджэння” прыходзіць да роздумаў пра смерць: “Мне тут няма што ўспамінаць – / У гэтым чэраве каменным, / Ды – неадступна і нязменна – / Я помню: мне тут паміраць… // Я вам зайздросціць не магу: / Вандроўнік я з планеты іншай, / Аднак тастаментна запішам: / Я вам яшчэ дапамагу…” [3]. У кнігах “Вертыкальныя рэкі святла…” і “Шляхам Белага каменя…” выразна выяўляецца філасафізм мыслення пісьменніка – чалавека з вялікім жыццёвым досведам. Шматлікія тэксты прысвечаны мастацкаму даследаванню апазіцыі “нараджэнне/жыццё – смерць”, якая ўвасабляецца і ў згаданым творы. Разважаючы пра непазбежны сыход, аўтар не толькі застаецца спакойным і ўраўнаважаным, але і выказвае ўпэўненасць у тым, што можа прынесці карысць. Фраза “Я вам яшчэ дапамагу…” вельмі дакладна раскрывае інтэнцыю гэтага верша і ўсяго паэтычнага набытку В. Зуёнка: праз слова рабіць свет лепшым.

“Усё навакольнае паўстае ў яго творах як частка ўласнай душы, розуму і лёсу паэта” [1, с. 644], – заўважыў У. Гніламёдаў. Сапраўды, В. Зуёнак імкнецца падзяліцца часткай уласнай душы, у чым і заключаецца місія Паэта:

“У сто вятроў падбіта паліто, / Іголкамі прашыта ледзянымі, / І сам – ужо не сам, амаль ніхто: / Настылы цень… / Але душа – на ўздыме!.. // Душа ляціць над горадам начным, / Над вашым сном у мякаці пярыннай. / І страшна вам задуманае ім: / На свет не гнеў, а весні спеў абрынуць” [3] (“Паэт”, 2001). На першы погляд вобразная палітра гэтага верша мала чым адрозніваецца ад той, што выкарыстоўвалася ў “інфернальных” карцінах: ноч, душа, цень… Аднак тут горад ужо не падаецца чужым і халодным, нават нягледзячы на надвор’е; цёмны і прамерзлы, ён здольны нахняць на “весні спеў”. На асацыятыўна-вобразным узроўні гэта мініяцюра вельмі блізкая да шэдэўра выяўленчага мастацтва “Над горадам” М. Шагала. У абодвух творцаў, пісьменніка і мастака, горад далёкі ад ідэалу, але ў ім магчыма быць шчаслівым, натхняцца, кахаць, пісаць палотны і вершы.

Колеры іншага жывапісца знойдзем у творы “Кажуць: убачыў грака…” (2002): “Кажуць: убачыў грака – / Мудрасць такая даўняя, – / То і вясну сустракай / Вітальнымі песнямі-дайнамі. // А як, калі не сакрэт, / Быць з сённяшняю акрасаю: / “Гракі прыляцелі” – сюжэт / Нязменны – з карціны Саўрасава. // Ці збіўся ў зямлі разварот, / Ці сонца іначай схіляецца: / Гракі-мінчукі круглы год / У горадзе аціраюцца” [3]. Падобныя тэксты апраўдваюць расхожы выраз “мастацтва слова” ў дачыненні да вынікаў пісьменніцкай працы. В. Зуёнак сузірае наваколле і фіксуе ў каларытных вобразах-дэталях убачанае, у выніку знаёмае і вядомае ператвараюцца ў новае і нечаканае.

“Яго пейзажная лірыка – гэта сапраўдны слоўны жывапіс, створаны сакавітымі фарбамі, пластычна-зрокавымі вобразамі” [2, с. 9], – выказанае раней назіранне актуальнае і ў дачыненні да гарадскога пейзажу. Варта дадаць, што ў гэтага аўтара ён часта дынамічны, рухомы, як, напрыклад, у вершы “Думаю аб падабенстве...” (2009): “Стадыён тысячавокі, / І адна на ўсіх людзей / Зрэнка – мяч надзьмутабокі – / Да варот пагляд вядзе. // Пас налева, пас направа, / Пас наперад, пас назад, – / Стадыён не мае права / Галавой круціць не ў лад. // Во як гол – тады ўжо ўгору / Вочы ўсе і рукі ўсе: / Стадыён ляціць і горад / За сабой уверх нясе!..” [4]. У фінале твора ўзнікае вобраз горада ў палёце. Падкрэслім, што метафара палёту, вобраз неба з’яўляюцца канцэптуальна значнымі ў творчасці В. Зуёнка. Прасторавыя каардынаты ўрбаністычнай паэзіі, як відаць, палягаюць у розных сферах: пад зямлёй, на зямлі, у небе. У верлібры “Няма неба…” (2020) яны ўвогуле сумяшчаюцца – начны горад разрастаецца, выходзіць за ўласныя межы, паглынаючы неба: “Няма неба. / Не згубілася – / Горад паглынуў. / Адабраў, / Падмяніўшы зоркі / Абманлівымі, штучнымі агнямі… // Зямля рыхтуе праводзіны – / А неба няма. / Глядзіш, як у цёмную бездань, / Дзе ніхто не чакае, / Куды страшна адыходзіць…” [4].

Такім чынам, В. Зуёнак успрымае горад, як і быццё ўвогуле, ва ўсёй складанасці і неадназначнасці: змрочныя малюнкі ўраўнаважваюцца ўрбаністычным жывапісам; вясковыя вобразы-“абярэгі” дапамагаюць паэту, гараджаніну ў першым пакаленні, знаходзіць кампраміс з жыццёвай стыхіяй,

што так і не стала па-сапраўднаму сваёй, захоўваць уласную ідэнтычнасць і ўнутраную гармонію.

Спіс літаратуры


1. Гніламёдаў, У. В. Васіль Зуёнак / У. В. Гніламёдаў // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015. – Т. 4. Кн. 1 : 1966–1985 / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – 2002. – С. 620–644.
2. Заяц, Н. Гаспадар паэтычнай Сялібы [прадм.] / Н. Заяц // Выбраныя творы / В. Зуёнак. – Мінск, 2010. – С. 5–24.
3. Зуёнак, В. Вертыкальныя рэкі святла: вершы сутоку тысячагоддзяў (1993–2006) [Электронны рэсурс] / В. Зуёнак // Васіль Зуёнак : сайт. – Рэжым доступу: https://sites.google.com/site/vasilzueenak/новыя-кнігі/вертыкальныя-рэкі-святла. – Дата доступу: 01.12.2022.
4. Зуёнак, В. Шляхам Белага каменя: вершы сустрэчных дзён (2007–2021) [Электронны рэсурс] / В. Зуёнак // Васіль Зуёнак : сайт. – Рэжым доступу: https://sites.google.com/site/vasilzueenak/новыя-кнігі/шляхам-белага-каменя. – Дата доступу: 01.12.2022.